*Серия «Литературный ковчег»*

# 75 ПОБЕДНЫХ ЛЕТ

## Сборник поэзии и прозы

Минск
«Колорград»
2020

УДК [821.161.1(476)+821.161.3]-822
ББК 84(4Беи=Рус)я43
С30

*Серия основана в 2009 году*
*Анатолием Бесперстых и Светланой Чижовой*

**75 победных лет** : сборник поэзии и прозы / сост. С. А. Чижо-
С30 ва. – Минск : Колорград, 2020. – 216 с. – (Серия «Литературный ковчег»).
ISBN 978-985-596-619-8.

Девятая книга народного творческого объединения «Литературный ковчег» приурочена к 9 Мая юбилейного года. Значительная часть произведений литераторов Полотчины посвящена теме Великой Отечественной войны. Также в поэзии и прозе авторов нашла отражение материя жизни послевоенных мирных лет, охватывающая грани природы, малой родины, патриотизма, духовности, Любви.

**УДК [821.161.1(476)+821.161.3]-822**
**ББК 84(4Беи=Рус)я43**

**ISBN 978-985-596-619-8**

© Чижова С. А., составление, 2020
© Оформление.
ООО «Колорград», 2020

## Надзея Салодкая

### «Ты баліш, мая памяць...»

**Вайна**

Лёталі Анёлы над палямі,
Плакалі над целамі спачылых…
А зямля была ў крывавых плямах
І дагэтуль боль не залячыла.

Мёртвыя, жывыя ўперамешку
З вырванным карэннем і жалезам…
І плыла над полем-галавешкай
Дымная смуродная завеса…

Не плугамі – бомбамі ўзараны
Край мой, спалены палеткі…
…Мама бацьку абмывала раны –
Праз гады той ліхавеі сведкі.

Лёталі Анёлы, горка-слёзна
Адпявалі душы ў паднябессі…
Зброя й сёння шчэрыцца пагрозна,
І гарэняць жальбай нашы песні…

* * *

У вайны не твар – пачварны выскал,
Без падзелу на мужчын-жанчын.
Божа крый, бо палыхае блізка!
Ёй людскія душы – ніпачым.

Злепленая з вірусаў вар’яцтва,
Гневу, і жадобы, і лухты,
Ёй да смаку з кровушкаю яствы,
Сквапныя крыўляюцца раты…

Гэта – мы?! І я, і ты, і кожны,
Хто для шчасця ўзрошчаны Зямлёй,
Чуеце, ляціць цягнік парожні,
Нашаю запэцканы крывёй…

Жах вайны мае бацькі спазналі.
Сёння свет на валаску вісіць.
Дык няўжо яшчэ не адстагналі
Ўсе ахвяры – памяці прасіць?!

**Не вершы**

**1.** Чалавек перадапошні
заб’е свайго суседа,
каб забраць ягоны набытак
і наталіць голад і смагу
яшчэ жывою крывёй…

**2.** Два апошнія чалавекі,
узяўшыся за рукі,
пойдуць разам
шукаць сабе
правіянту і прытулку…

**3.** Два апошнія чалавекі
будуць гучна і доўга
гукаць адзін аднаго,
але так і не дачуюцца…

**4.** Два апошнія чалавекі…
Іх можа проста не быць…
      …Які з варыянтаў
найбольш прадказальны?
Жахліва, але, хутчэй за ўсё, апошні.
Хаця кожны з іх досыць жудасны…

* * *

Не злуюся я, проста скрушна,
Што дурноты вакол замнога,
Што ад смецця смуродна-душна,
А пачуцці – прытулак злога…

Не да смеху, бо не стрывае
Ні Гасподзь, ні планета здзеку…
Чалавек сам сябе збывае,
Бо зрабіўся ў душы калекам.

Спажывае намнога болей,
Чым яму для жыцця патрэбна,
І не спыніцца ўжо ніколі…
Толькі ўзносіць сябе хвалебна!

А насамрэч… А хто мы, людзі?
Ані ўдзячнасці, ні павагі…
Па віхлястых дарогах блудзім,
Вусны сушыць ад лютай смагі…

Век мужчына кахаў жанчыну,
Сёння іх разрывае нешта…
І здаецца ўжо немагчымым
Люд ад бруду адмыць дарэшты.

Душыць сквапнасць… Душа – пустэча…
Толькі б з верхам напхаць валізы…
А яны прыціскаюць плечы…
На сябе ўрэшце глянем зблізу?..

* * *

На мяжы духоўнага сталення,
Калі ты ўжо зведаў, што пачым,
Прагне розум веры і малення –
Дзейсвам тым правіны залячыць.

І плыве прачуласць да Нябёсаў,
Просьба даравання за грахі,
Іх наўспамінала ці не стосы
Самых розных – дробных і цяжкіх.

Некага пакрыўдзіла няўвагай,
Назаляла просьбамі не ў час.
Чулася тады я ў тым няблага,
Паўстаю цяпер вось без прыўкрас.

Цісне плечы і свядомасць пляміць
Тое, што з дурноты прарасло
І па сёння думы мае раніць…
Адкасніся ж, зробленае зло!

Час настаў, і выспела нагода
Прыкрасці адчуць і ўразумець,
Павініцца ціхамірна-годна,
І прызнацца ў любасці паспець.

**Балада пра памяць**

Ты баліш, мая памяць,
хоць не знала вайны,
Бо прыходзіш ад мамы
ў неспакойныя сны.
Ты прыходзіш, чужая,
а нібыта мая,
Вострым полымем джаліш
маё сэрца здаля.

Жах той вайны мне спавядала маці
Бяссоннем хваравітым па начах –
І я жыла ў страшэннай кожнай даце,
Дзе боль застыў у маміных вачах.

Я ў памяць мамы ўнікла ўсёй істотай:
Я рану заціскала ў жываце,
Паўзла з дзіцём агромністым балотам,
Бо паміраць ніхто там не хацеў.

Вайна страляла, вухкала, дыміла,
Руйнуючы сядзібы, лёсы, дні,
Сабой дасыта смертухну карміла,
І я згарала ў жудасным агні…

Мяне жыўцом палілі ліхадзеі,
І я вісела з шыльдай на грудзях…
Я не была ў далёкіх тых падзеях,
Ды выпіла задымлены прасцяг…

Чарнелі ямы на ўзарваных гонях,
Бялелі скроні воінаў і ўдоў...
Я на ласкавых маміных далонях
Выходзіла з прастрэленых гадоў.

Туды вяртацца памяццю павінна,
Жывы малюнак з мамінай душы:
Укрыжаваная вялікая краіна
На абгарэлым курчыцца Крыжы…

Мне летаў многа, Перамозе – болей,
Раслі мы з ёю ў радасці і не,
А памяць-ноша – гэты вырак болю
Ніколі ўжо мяне не абміне.

Ля сціплых і шыкоўных абеліскаў
Палаюць кветкі кроплямі крыві –
Я галаву схіляю нізка-нізка
Перад усімі, хто яе праліў.

Ты баліш, мая памяць, хоць не знала вайны,
Бо прыходзіш ад мамы ў неспакойныя сны.
Ты прыходзіш, чужая, а нібыта мая,
Вострым полымем джаліш маё сэрца здаля.

**Мая ручаінка**

У мяне ёсць свая ручаінка –
Памяць чэпка трымае ў сабе.
Пачынаўся з лясной лугавінкі
Яе звонкі, імклівы разбег.

Я такой чысціні больш не ўбачу
І такой смакаты не знайду!
Праз жыццё тым каменьчыкам дзячу,
Па якіх, басаножка, іду…

У дзіцячых далоньках – як цацкі,
Імі ў колерах выслана дно…
Я падумала раптам знянацку:
Як бабуліна з кроснаў радно!

Так плыве ад “тады” да налецця
Ручаінка паміж медуніц.
У маім ці не кожным дасвецці –
Гаваркая таемнасць крыніц.

Прытаіліся ў травах мурожных,
Каб напоўніць сабой мой ручай, –
Сёння тупаю я асцярожна
І гляджу на яго з-за пляча…

# Александр Мартыненко

## «Закружились звёзды…»

### Звёзды

*Поэма*

Я и сам теперь не знаю даже,
Почему я думаю о них…
Может, потому, что ты однажды
Высмеяла мой нескладный стих,
И, любуясь красками рассвета,
Ты вздохнула: «Завтра приходи.
А тебе, ты знаешь, до поэта,
Как до той вон звёздочки, гляди…»
И, ты помнишь, не был я в обиде –
Я тебе с улыбкою сказал:
«Если эту звёздочку увидеть
Не на небе, а в твоих глазах, –
Так уж далеко? – совсем ведь рядом…
Видишь – невозможного и нет…»

…Вот сейчас бы встретиться нам надо
Через столько врозь прожитых лет.
Звёздочка… Она всегда со мною,
Я её средь тысяч отыщу,
Радуюсь я с нею, как с тобою,
Как с тобою, с нею я грущу.
Часто в караулах и на маршах,
Нет когда и быть не может сна,
Ярко светит мне на небе наша
Звёздочка. И помнится: весна
И букет черёмухи огромный, –
Ты в него зарылась головой, –

Твой наряд – красивый, лёгкий, скромный,
Смех задорный и счастливый твой
Помню. И всегда, не знаю просто,
Как сказать, но исчезают вмиг
Все заботы – я тогда о звёздах
Думаю, небесных и земных.
И к чему такие переходы,
Переливы собственной души?..
Может, я старею? Годы, годы…
Может, молодею? Подскажи…
Звёзды, звёзды… Под копыта вёрсты,
Снег и грязь, сыпучие пески…
Вы ль не стыли в удивленье, звёзды,
Видя краснозвёздные полки?!
В сабельном походе чья-то юность,
О большой любви мечту храня,
Вдруг на всём скаку как бы споткнулась
И упала с верного коня.
Ночь пестрела саблями, штыками…
И у всей Вселенной на виду
Умирала юность, сжав руками
Красную будёновки звезду,
И глядела синим-синим взглядом
На бесшумный яркий звездопад,
Думая: «Вперёд… вперёд бы надо…
Я живой, ещё живой солдат…»
Но не сделать шаг, не шевельнуться –
Умирает тело и мечты…
Нет! Мечты в живущих остаются!
Так, как свет угаснувшей звезды
Льётся много лет, да и столетий:
Нет звезды, а свет её горит.
И о ней ведь кто-то на планете
«Вон звезда…» – любимой говорит.
Так вот и мечты живут, как звёзды,
В каждом сердце и во всех сердцах.